**Праграма прэзентацый і круглых сталоў**
**Presentations and round tables**

**15.09. 8-9.30 -** Дыскусія ў Нямецкім гістарычным інстытуце **“Пераадольваючы дыхатамію "ахвяра"/"кат": новыя падыходы да вывучэння беларускай гісторыі і грамадства” /** Discussion in the German Historical Institute **‘Agency in the Belarusian society’**
**16.09.**
**17.00-18.30** Дыскусія **“Дачыненні паміж уладай і беларускай грамадзянскай супольнасцю ў 2017 годзе: маятнік ці пазітыўныя змены?” /** Discussion **“Interaction between the authorities and civil society in Belarus in 2017 – a good change or a pendulum?”**
**17.00-18.30.** Круглы стол **“Гендарныя даследванні ў смутныя часы: да 20-годдзя Цэнтра гендарных даследаванняў ЕГУ” /** Round table **“Gender studies in contradictory times: 20 years of EHU Center for Gender Studies”**
**17.00-18.30.** Круглы стол **"Беларусь: паміж дэсаветызацыяй і рэсавэтызацыяй" /** Round table **“Belarus: between de-sovietization and re-sovietization”**
**17.00-18.00. Прэзентацыя новых кніг / Presentation of new books**

**Пятніца, 15 верасня**
**Friday, September 15th**
**8.30-9.30, Pałac Karnickich, al. Ujazdowskie 39**

Дыскусія ў Нямецкім гістарычным інстытуце **“Пераадольваючы дыхатамію "ахвяра"/"кат": новыя падыходы да вывучэння беларускай гісторыі і грамадства”**
Discussion in the German Historical Institute **‘Agency in the Belarusian society’**

Удзельнікі/Participants:
Вольга Сасункевіч (Olga Sasunkevich, Gothenburg University)
Святлана Паляшчук (Svetlana Poleschuk, European Institute Florence)
Алена Гапава (Elena Gapova, Western Michigan University)
Марк Берман (Mark Berman, Justus-Liebig- Universität Gießen)
Фелікс Акерман (Felix Ackermann, German Historical Institute Warsaw)

Як змяніць пункт гледжання на беларускае грамадства і прыняць новую перспектыву найноўшай гісторыі гэтай краіны? Гэты “акадэмічны сняданак” стане форумам для дыскусіі пра тое, што зараз сабою ўяўляюць даследаванні Беларусі, і якія новыя падыходы і праблемы патрэбны, каб ажывіць гэта даследчае поле на рэгіянальнай і міжнароднай акадэмічнай арэне. Галоўная мэта дыскусіі – выйсці па-за наратывы дыктатуры і аўтарытарызма, а таксама бясконцай гісторыі няўдалага беларускага нацыяналізму, тых інтэрпрэтацыйных схемаў, якія часта ўжываюцца для разумення Беларусі ў навуковай літаратуры ў Заходняй Еўропе і Паўночнай Амерыцы. На гэтым круглым стале будуць прэзентаваныя падыходы, заснаваныя на арыгінальным матэрыяле даследаванняў беларускай гісторыі, палітыкі і грамадства. Галоўнае пытанне – ці карысны канцэпт аўтаноміі/агентаў (дзеяння) для вызначэння беларускіх індывідуальных і калектыўных

актараў, што праяўляюць свае мэты ў розных практыках, (не)зважаючы на дзяржаўны ціск.

How to change the optics on Belarusian society and take a new perspective on its most recent history? This academic breakfast provides a forum for discussion of what Belarusian Studies are today and which new approaches and questions are needed to revitalize the field in the regional and international academic arena. The major aim of the discussion is to go beyond the narratives of dictatorship and authoritarianism as well as that of a never-ending story of failed Belarusian nationalism - interpretive schemes that are frequently used for understanding Belarus in scholarly literature in Western Europe and Northern America. Bringing together perspectives based on original empirical material from Belarusian history, politics, and society, this round table combines a discussion of the concept of autonomy/agency with its applicability to trace how individual and collective actors who define themselves as Belarusian - or otherwise - have manifested their agendas in various practices in spite of and in reaction to state pressure.

**16 верасня, 17.00-18.30**
**September 16th, 17.00-18.30**
**ILS - Instytut Lingwistyki Stosowanej UW, ul. Dobra 55**

| | | |
|---|---|---|
| **Дачыненні паміж уладай і беларускай грамадзянскай супольнасцю ў 2017 годзе: маятнік ці пазітыўныя змены?**<br>Мадэратар: Лукаш Бырскі (Усходнееўрапейскі дэмакратычныя цэнтр, Польшча)<br>Выступоўцы: Уладзімір Лабковіч (праваабарончы цэнтр “Вясна”, Беларусь), Святлана Зінкевіч (Офіс еўрапейская экспертызы і камунікацыі, Беларусь), Андрэй Казакевіч (Інстытут “Палітычная сфера”, Беларусь),<br><br>Асноўныя пытанні:<br>1. Якія асноўныя тэндэнцыі ў развіцца грамадзянскай супольнасці Беларусі ў 2017 годзе? Можна назіраць як негатыўныя, так і працяг пазітыўных тэндэнцый. Што гэта значыць і наколькі сітуацыя ўстойлівая?<br>2. Ці можна пазначыць новыя правілы гульні ва ўзаемадзеянні дзяржавы і НДА? Што зараз выступае “чырвовай” лініяй, а што атрымлівае фармальную і нефармальную падтрымку?<br>3.GONGO, НДА, лакальныя ініцыятывы – канкурэнцыя, супрацьстаянне ці супрацоўніцтва? Якім чынам можна выглядаць развіццё ўзаемадзеянне розных тыпаў арганізацый ў бліжэйшай будучыні.<br><br>**Interaction between the authorities and civil society in Belarus in 2017 – a good change or a pendulum?**<br><br>Moderator: Łukasz Byrski (East European Democratic Center, Poland)<br>Speakers: Uladz Labkovich (Human Rights Center *Viasna,* Belarus), Sviatlana Zinkievich (Office of European Expertise and Communication, Belarus), Andrei Kazakevich (*Political Sphere* Institute, Belarus).<br><br>Main questions:<br>1. What are the main tendencies in the development of civil society in | **17.00-18.30** | ILS, 01.079 |

<table>
<tr><td>Belarus in 2017? One can observe the negative as well as a continuation of positive trends. What are the implications and how sustainable this picture might be?<br><br>2. Can new rules of the game be identified between the state and the non-governmental organisations? What can now be described as a “red line” for civic initiatives and what is the kind that receives formal and/or informal support?<br><br>3. GONGO’s, NGO’s, local initiatives – competition, conflict or cooperation? How an interaction between various types of organisations may look like in the near future?</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Круглы стол «Гендарныя даследванні ў смутныя часы: да 20-годдзя Цэнтра гендарных даследаванняў ЕГУ»<br>Падчас круглага стала, прасвечанага 20-годдзю Цэнтра гендарных даследванняў ЕГУ, мы прапануем абмеркаваць тое пытанне, якое імпліцытна прысутнічала пры заснаванні Цэнтра: ці маюць гендарныя даследаванні патэнцыял для таго, каб пераструктараваць суадносіны паміж ведамі (акадэміяй), актывізмам і палітыкай? У пэўным сэнсе тыя пытанні, якія мы ставім перад сабой, маюць дэпрэсіўнае гучанне кшталту «што пайшло не так?», альбо чаму аптымізм, які суправаджаў узнікненне і развіццё гендарных даследванняў у рэгіёне, апынуўся недастатковым для з’яўлення новых сацыяльных і палітычных форм, новых неіерархічных спосабаў арганізацыі акадэміі? Але адначасова мы хочам асэнсаваць і пазітыўныя моманты развіцця гендарных даследванняў, у прыватнасці, тыя новыя перспектывы у разуменні сацыяльнага, якія сталі магчымымі з развіццём гендэрнай і феміністкай тэорыі на постсавецкай прасторы.<br><br>Round table ‘Gender studies in contradictory times: 20 years of EHU Center for Gender Studies’<br>We suggest to use 20th anniversary of EHU Center for Gender Studies as a possibility to raise the question that implicitly was there when the Center was established – do gender studies have the potential to restructure relations between knowledge/academia, activism and politics? In a certain sense we are driven by a depressing attempt to understand what went wrong and why the promises of gender theory have remained unfulfilled in our region, why gender studies have failed to bring into life new forms of political and social relations or at least non-hierarchical ways of organization in academia and activism. But at the same time we use this opportunity to talk about positive developments of gender studies in the region, about new perspectives on social and political which gender studies and feminist theories brought into the understanding of the past and present in the post-Soviet region.</td><td>17.00-18.30</td><td>ILS, 01.082</td></tr>
<tr><td>Круглы стол "Беларусь: паміж дэсаветызацыяй і рэсавэтызацыяй"<br><br>Удзельнікі: Альміра Усманава, Аляксандр Фядута, Тацяна Чуліцкая, Ірына Раманава, Ала Пігальская і Алег Брэскі.<br><br>Падчас круглага стала мяркуецца разгледзіць пытанне аб тым, што ж адбываецца ў даследаванні «савецкага» і постсавецкага ў Беларусі (але ня толькі) у розных дысцыплінарных галінах. Акрамя класічнага і досыць вузкага разумення панятку савецкае і постсавецкае ўвага</td><td>17.00-18.30</td><td>ILS, 01.073</td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| надаецца таксама параўнаўчай пэрспэктыве - разуменню дэсавэтызацыі і рэсавэтызацыі ў больш шырокім геапалітычным кантэксце. Да тлумачэння сучасных тэндэнцыяў дэсавэтызацыі, а ў некаторых краінах і сфэрах рэсавэтызацыі запрашаюцца спецыялісты з розных навуковых галінаў: палітынай навукі, права, гісторыі. літаратуразнаўстава, філязофіі, культуралёгіі і мастацтва.<br><br>**Belarus: between de-sovietization and re-sovietization**<br><br>During the roundtable the participants will share their visions about what is happening in the Soviet and Post-Soviet studies in Belarus (but not only) in various research areas.<br><br>Besides rather narrow and old fashioned understanding of the concept of the Soviet and Post-Soviet the participants will focuse on the understandings of de-sovietization and re-sovietization in comparative perspective within geopolitical contexts.<br><br>To explain the modern trends of de-sovietization or in some cases of re-sovietization in more interdisciplinary way the experts from different scientific fields are invited to launch the discussion: political science, law, history, theory of literature, philosophy, culture and art. | | |
| **Уладзімір Падалінскі**<br>Прэзентацыя кнігі<br>*“Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 г. Удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай”*<br>Манаграфія прысвечана дзейнасці і персанальнаму складу дэлегацыі Вялікага Княства Літоўскага на першым вальным сойме Рэчы Паспалітай, які адбываўся ў Любліне з 2 ліпеня па 12 жніўня 1569 г. У кнізе аналізуецца палітычная пазіцыя дэлегацыі ВКЛ па разнастайных праблемах дзяржаўнага жыцця, разглядаецца праблема існавання ў Вялікім Княстве самастойнага шляхецкага руху. Упершыню робіцца спроба стварыць калектыўны партрэт сенатараў і земскіх паслоў ВКЛ, якія ўдзельнічалі ў працы сойма 1569 г.<br>**Uladzimir Padalinski**<br>Presentation of the book<br>***The representation of the Grand Duchy of Lithuania at the Lublin Diet of 1569: participation in the activities of the First General Diet of the Commonwealth***<br>The book is devoted to the study of activities and personal composition of the Grand Duchy of Lithuania delegation at the First General Diet of the Commonwealth that was held in Lublin from 2 July to 12 August 1569. The monograph examines the political position of the GDL delegation on various issues of public life and the problem of the existence of independent gentry movement in the Grand Duchy of Lithuania. The book also makes the first attempt to create a collective portrait of the GDL senators and district representatives at the Diet of 1569. | **17.00-17.15** | ILS, 01.076 |
| **Вячаслаў Швед**<br>Прэзентацыя кнігі<br>***"Рэквіум паўстанцам 1863 г. Гродзенская губерня."*** | **17.15-17.30** | ILS, 01.076 |

| | | |
|---|---|---|
| Выдадзеная на сродкі, сабраныя на сайце "Талака". У кнізе апавядаецца пра розныя катэгорыі паўстанцаў: вайскоўцы, цывільныя, гімназісты, жанчыны і пра розныя формы паўстання: дэманстрацыйны рух, вайсковыя дзеянні. У кнізе шмат дадаткаў, спісаў удзельнікаў паўстання.<br>**Viačaslaŭ Švied**<br>Presentation of the book<br>***Requiem for the rebels of 1863. Hrodna province.***<br>Funded by the donations from the Talaka crowdfunding website, the book tells about the different categories of the rebels of the 1863 uprising: military, civil, gymnasium students, women and different forms of the uprising: demonstrations and warfare. The book contains many additives, including the lists of the participants of the uprising. | | |
| **Томаш Блашчак**<br>Прэзентацыя кнігі<br>***Białorusini w Republice Litewskiej 1918-1940, Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2017.***<br>Манаграфія прысвечана вывучэнню гісторыі беларусаў у міжваеннай Літве. На матэрыялах літоўскіх, беларускіх, расійскіх і польскіх архіваў у кнізе разглядаюцца: адносіны беларусаў і літоўцаў у перыяд нацыянальнага адраджэння і дзяржавабудаўніцтва, роля беларусаў ў дзяржаўных структурах Літвы: парламенце, урадзе, войску і дыпламатыі, моманты з жыцця беларускай дыяспары ў незалежнай Літве.<br>**Tomasz Blaszczak**<br>Presentation of the book<br>***Belarusians in the Republic of Lithuania in 1918-1940, Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2017.***<br>The monograph is devoted to the study of the history of Belarusians in the interwar Lithuania. On the materials of Lithuanian, Belarusian, Russian and Polish archives the book studies the relationship between Belarusians and Lithuanians during the period of national revival and state building, the role of Belarusians in the state institutions of Lithuania: parliament, government, army and diplomacy, as well as episodes from the life of Belarusian diaspora in independent Lithuania. | **17.30-17.45** | ILS, 01.076 |
| **Алена Маркава**<br>Прэзентацыі кнігі<br>***“Шлях да савецкай нацыі. Палітыка беларусізацыі, 1924-1929”, Мінск: БГА, 2016.***<br>Кніга з’яўляецца першым абагульняючым даследваннем нацыянальнай палітыкі беларусізацыі (1924-1929) і звязаных з ёй працэсаў фармавання сучаснай беларускай нацыі. У манаграфіі аналізуюцца прычыны поспехаў і няўдач беларусізацыйных мерапрыемстваў, даследваюцца ўзаемаадносіны ўлады і нацыянальнай эліты, разглядаецца беларусізацыя дзяржаўнага апарату і сістэмы адукацыі. Значная ўвага аддаецца даследванню стаўлення насельніцтва да правядзення нацыянальнай палітыкі і пытанню беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.<br>**Alena Marková**<br>Presentation of the book<br>***The road toward Soviet nation. Nationality policy of Belarussization, 1924-1929. Minsk: BHA, 2016.*** | **17.45-18.00** | ILS, 01.076 |

| | | |
|---|---|---|
| The books inquires into the soviet nationalities policy of belarussization taking place in 1924 through 1929 in the territory of the Belarussian Soviet Socialistic Republic. It present the first comprehensive synthetic work describing Belarussian nationalities policy of the inter-war period. The belarussization policy involved intensive elaboration of the Belarussian language (its codification, intellectualization, creation of technical terminologies, etc.) and its promotion in the public sphere. nation and to contribute to the gradual formation of Belarussian national elites. The book analyzes processes of belarussization and of its implementation in state administration, in public schools, and in the army. Particular attention is paid to reactions and feedback of local population (urban as well as rural population, and also of population of various social strata) to the nationalities policy. | | |
| **Андрэй Чарнякевіч**<br>Прэзентацыя кнігі<br>***"Чужы сярод чужых. Павел Аляксюк і беларускія "паланафілы"***<br><br>У новай кнізе вядомага даследчыка айчыннай гісторыі XX ст. Андрэя Чарнякевіча ў жанры палітычнай біяграфіі апісваецца жыццё і дзейнасць Паўла Алексюка — адной з самых супярэчлівых фігур беларускага на цыянальнага руху першай трэці XX ст.<br><br>**Andrej Čarniakievič**<br><br>Presentation of the book<br>***The stranger among strangers. Paviel Aliaksiuk and the Belarusian Polonophiles***<br><br>In his new book a well-known researcher of Belarusian history of the 20th century Andrej Čarniakievič in the genre of political biography describes the life and work of Paviel Aliaksiuk - one of the most controversial figures in the Belarusian national movement of the first third of the 20th century. | **18.00-18.15** | ILS, 01.076 |
| **Уладзімір Месамед**<br>Прэзентацыя кнігі<br>***“Феномен белорусско-иранских отношений”***<br>Выдадзена у снежні 2016 года Інстытутам Блізкага Ўсходу (Масква).<br><br>**Vladimir Mesamed**<br>Presentation of the book<br>***The phenomenon of the Belarusian-Iranian relations***<br>The book was published in December 2016 by the Middle East Institute in Moscow. | **18.15-18.30** | ILS, 01.076 |
| **Андрэй Масквін**<br>Прэзентацыя выданняў, прысвечаных беларускай драматургіі і тэатру:<br>***1. Андрэй Масквін. Беларускі тэатр 1920-30- х: адабраная памяць.Мінск: Логвінаў; 2016.***<br>***2. Nowa dramaturgia białoruska (pod redakcją Andrieja Moskwina). T. 4. Paweł Priażko. Warszawa: Wydawnictwo UW, 2017.***<br>***3. Nowa dramaturgia białoruska. (pod redakcją Andrieja Moskwina). T. 5. Dmitrij Bogosławski, Warszawa: Wydawnictwo UW, 2017.***<br><br>**Andrej Moskwin**<br>Presentation of publications on the Belarusian drama and theater: | **17.00-17.40** | ILS, 01.082 |

<table>
<tr><td>1.Andrej Moskwin. Belarusian theater in 1920-1930s: the taken memory. Minsk: Lohvinau; 2016.<br>2. The new Belarusian drama (edited by Andrej Moskwin). T. 4. Paweł Priażko. Warszawa: Wydawnictwo UW, 2017.<br>3. The new Belarusian drama (edited by Andrej Moskwin). T. 5. Dmitrij Bogosławski, Warszawa: Wydawnictwo UW, 2017.</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Віктар Корбут<br>Прэзентацыя альбома Віктара Корбута і Дзмітрыя Ласько "Мінск. Спадчына старога горада. 1067-1917".<br>Гэта кніга -- першае выданне, у якім сабраны звесткі пра ўсе будынкі Мінска, што былі пабудаваны да 1917 года і захаваліся да нашых дзён. Альбом змяшчае як архіўныя фота, так і здымкі, зробленыя ў 2016 годзе: на іх адлюстраваны як самі архітэктурныя аб'екты (храмы, манастыры, палацы, жылыя і грамадскія будынкі), так і панарамныя фота гістарычнага цэнтра і асобных раёнаў горада, выданне праілюстравана інтэр'ерамі значных гістарычных будынкаў Мінска.</td><td>17.40-18.00</td><td>ILS, 01.082</td></tr>
<tr><td>Прэзентацыя кнігі<br>Анталогія беларускай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду “Бліскавіцы”(Мінск, “Кнігазбор”, 2017. Укладанне, каментар: Аксана Данільчык, Віктар Жыбуль).<br><br>Анталогія беларускай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду “Бліскавіцы” – унікальнае выданне. Упершыню пад адной вокладкай змешчаны творы 61 беларускай паэткі, створаныя ў “міжваенны” перыяд – з 1918 па 1941 г., што адлюстроўвае панараму літаратурнага жыцця эпохі. Жаночая паэзія паказана як ува ўсёй сваёй мастацкай разнастайнасці, так і ва ўсёй мастацкай шматузроўневасці. Анталогія дапаможа па-іншаму паглядзець на літаратурны працэс 20–30-х гадоў і на ўдзел у ім жанчын. Укладальнікі імкнуліся паказаць не толькі найлепшае, але і характэрнае для тых часоў, даць магчымасць прагучаць забытым галасам беларускіх паэтак, а таксама паспрыяць актывізацыі даследаванняў іх паэзіі, каб вярнуць беларускую жаночую паэзію міжваеннага перыяду з “няведамасці”, каб аднавіць гістарычную і мастацкую справядлівасць.<br>Тут прадстаўленыя і паэткі, чыя творчасць даўно ўвайшла ў скарбонку айчыннай літаратуры, і напаўзабытыя, і забытыя зусім літаратаркі, а таксама тыя аўтаркі, чыя прысутнасць у літаратуры мела спарадычны або выпадковы характар і чые творы маюць не эстэтычную, а перадусім гістарычную каштоўнасць і будуць цікавыя гісторыкам, сацыёлагам і даследчыкам гендарнай праблематыкі.<br>У прэзентацыі возьмуць удзел адна з укладальніц Аксана Данільчык, крытык Ганна Янкута і іншыя.<br><br>Presentation of the book<br>Anthology of the Belarusian female poetry of the interwar period ‘Lightnings’ (Minsk, Knihazbor, 2017.Composition and comments by Aksana Daniĺčyk and Viktar Žybuĺ)<br><br>The anthology of Belarusian female poetry of the interwar period ‘Lightnings’ is a unique publication. For the first time the book gathered the works of 61 Belarusians female poets created in the interwar period from 1918 to 1941, which reflects the panorama of the literary life of that epoch.</td><td>18.00-18.30</td><td>ILS, 01.082<br>.</td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| The book shows female poetry in all its artistic diversity and on various levels. The anthology helps to take a fresh look at the literary process in the 1920-1930s and the role of women in it. The authors sought to show not only the best literary pieces, but also the characteristic features of the time, to let forgotten voices of Belarusian female poets sound, as well as encourage the research of their poetry in order to return it from oblivion and to restore historical and artistic justice.<br>The book presents both the poets whose works have become the treasure of the national literature, and partly or completely forgotten authors, as well as those whose presence in the literature has been sporadic or random, and whose works have not aesthetic, but above all historical value and will be of interest to historians, sociologists and researchers of gender.<br>The presentation will feature one of the composers of the book Aksana Daniĺčyk, literary critic Hanna Jankuta and others. | | |